УДК 94(476)

# Айчынная гістарыяграфія пытання фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг.

***Бараноўскі А.В.***
*Дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Мінск*

*Навуковая актуальнасць абранай тэмы абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай гістарыяграфіі комплексных даследаванняў па фарміраванні паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. Разам з тым гістарычная навука патрабуе поўнага і аб'ектыўнага вывучэння гісторыі беларускай дзяржаўнасці і фарміравання тэрытарыяльных меж беларускай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што спецыяльных даследаванняў, прысвечаных дадзенай тэме, няма, некаторыя яе асобныя аспекты вывучаліся беларускімі гісторыкамі.*

*Мэта артыкула – прааналізаваць айчынную гістарыяграфію фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. і выявіць тэндэнцыі яе эвалюцыі.*

***Матэрыял і метады.*** *У дадзенай публікацыі быў прааналізаваны комплекс прац беларускіх даследчыкаў, якія закранаюць асобныя аспекты фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. Даследаванне абапіраецца на традыцыйныя гістарычныя метады, такія як гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-праблемны. Выкарыстоўваюцца таксама агульнанавуковыя метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Гістарыяграфічны аналіз паказаў, што прац, якія б у комплексе закранალі фарміраванне паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг., амаль няма. Таму да дадзенага даследавання была прыцягнута значная колькасць прац, якія закранаюць асобныя аспекты фарміравання тэрыторыі Беларусі. Першы звязаны з выдзяленнем тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў са складу ССРБ у 1919 г. Другі прысвечаны вяртанню ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР у 1924 г. Для абодвух напрамкаў характэрна ўвага на пазіцыю і аргументацыю па гэтых пытаннях партыйных і савецкіх органаў РСФСР, БССР, губерняў і слабая цікавасць да пазіцыі мясцовага насельніцтва, інтэлігенцыі і нізавых партыйных і дзяржаўных структур.*

***Заключэнне.*** *Аналіз комплексу гістарыяграфічных крыніц па гісторыі фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. паказаў, што існуючыя да цяперашняга моманту навуковыя працы хоць і закранаюць многія аспекты гэтага пытання, але не вычэрпваюць усёй глыбіні праблемы, а таму гэта з'яўляецца падставай для далейшага вывучэння заяўленай тэмы.*

***Ключавыя словы:*** *паўночна-ўсходняя мяжа БССР, вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый, Віцебская губерня.*

*(Ученые записки. – 2019. – Том 30. – С. 13–18)*

# Domestic Historiography of the Issue of Shaping the North-Eastern Border of the BSSR in 1919–1924

***Baranovsky A.V.***
*State Scientific Establishment "Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk*

*The scientific relevance of the topic is due to the lack of a comprehensive study in the national historiography on shaping in the BSSR the north-eastern border in 1919–1924. However, the science of history requires a thorough and objective study of the history of the Belarusian statehood and the shaping of the territorial boundaries of the Belarusian state. Despite the fact that there is no special study on the subject some of its individual aspects were studied by Belarusian historians.*

*The purpose of the article is to analyze the domestic historiography of shaping the north-eastern border of the BSSR in 1919–1924 and to identify trends in its evolution.*

***Material and methods.*** *A complex of works by Belarusian researchers was analyzed, which deal with certain aspects of shaping the north-eastern border of the BSSR in 1919–1924. The study is based on traditional historical methods, such as historical-comparative, historical-systemic and historical-problematic. General scientific methods are also used.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: sasha9209@mail.ru –* ***А.В. Бараноўскі***

***Findings and their discussion.*** *The historiography analysis showed that there are almost no works that would deal with shaping the north-eastern border of the BSSR in 1919–1924. Therefore, a significant number of works involving certain aspects of the formation of the territory of Belarus were involved in this study. The first is connected with the separation of the territory of the Vitebsk, Mogilev and Smolensk provinces from the SSRB in 1919. The second is devoted to the return of the East Belarusian territories to the BSSR in 1924. Both directions are characterized by paying attention to the position and argumentation on these issues of the Party and Soviet bodies of the RSFSR, BSSR, provinces as well as weak interest in the position of the local population, intelligentsia and lower level party and state bodies.*

***Conclusion.*** *The analysis of the set of historiography sources on shaping the north-eastern border of the BSSR in 1919–1924 showed that the scientific papers existing to date, although they touch on many aspects of this issue, do not exhaust the entire depth of the problem, and therefore this is the basis for further study of the claimed topic.*

***Key words:*** *the north-eastern border of the BSSR, the return of the Eastern Belarusian territories, Vitebsk Province.*

*(Scientific notes. − 2019. − Vol. 30. − P. 13−18)*

Фарміраванне тэрытарыяльных меж – складаны і супярэчлівы гістарычны працэс, паколькі станаўленне і змяненне меж звязана з унутранай і знешняй палітыкай дзяржаў. Фарміраванне адміністрацыйных меж на лакальным узроўні, на нашу думку, прадстаўляе асаблівую цікавасць. Пад паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжой БССР мы разумеем мяжу, што праходзіла з другой паловы 1924 г. паміж Віцебскай і Полацкай акругамі БССР з аднаго боку і Пскоўскай губерняй РСФСР з другога. Яе фарміраванне адбывалася ў складаных палітычных абставінах і засталося практычна па-за ўвагай даследчыкаў.

Мэта артыкула – прааналізаваць айчынную гістарыяграфію фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. і выявіць тэндэнцыі іх эвалюцыі.

**Матэрыял і метады.** У дадзенай публікацыі быў прааналізаваны комплекс прац беларускіх даследчыкаў па гісторыі фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. Даследаванне абапіраецца на традыцыйныя гістарычныя метады, такія як гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-праблемны. Выкарыстоўваліся таксама агульнанавуковыя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У айчыннай гістарыяграфіі адсутнічаюць комплексныя даследаванні па фарміраванні паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг. Разам з тым гістарычная навука патрабуе поўнага і аб’ектыўнага вывучэння гісторыі беларускай дзяржаўнасці і фарміравання тэрытарыяльных меж беларускай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што спецыяльных даследаванняў, прысвечаных дадзенай тэме, няма, некаторыя яе асобныя аспекты вывучаліся айчыннымі гісторыкамі. Так, першай працай у беларускай гістарыяграфіі, у якой на падставе дакументальных і картаграфічных крыніц разглядаецца гісторыя фарміравання меж Беларусі, з’яўляецца кніга Л. Казлова і А. Цітова “Беларусь на сямі рубяжах”. Яе аўтары даволі грунтоўна прааналізавалі працэс вяртання часткі тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад БССР, а таксама фарміраванне віцебска-пскоўскага ўчастка адміністрацыйнай мяжы паміж БССР і РСФСР [1, с. 47–58]. Станаўленне меж Беларусі з’яўляецца самастойным прадметам даследавання і ў дысертацыі [2], а затым манаграфіі [3] С. Хоміча.

Іншых прац, якія б у комплексе закраналі гісторыю фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у абазначаны перыяд, няма. Таму да дадзенай працы прыцягнута значная колькасць работ, якія раскрываюць асобныя аспекты фарміравання тэрыторыі Беларусі.

Першы звязаны з выдзяленнем тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў са складу ССРБ у 1919 г. Так, Ф. Турук у нарысе “Белорусское движение” адным з першых даследчыкаў закрануў праблему скарачэння тэрыторыі ССРБ. На яго думку, гэта адбылося дзякуючы таму, што з’езды Саветаў Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў падтрымалі рашэнне ЦК РКП(б) аб сваім выдзяленні са складу Беларускай рэспублікі [4].

В. Кнорын у артыкуле “Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі” прывёў тлумачэнне матываў, якія, на яго погляд, паўплывалі на рашэнне аб скарачэнні тэрыторыі Беларускай рэспублікі. Менавіта гэтае абгрунтаванне выдзялення Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў стала дамінуючым на доўгія часы ў гістарыяграфіі. В. Кнорын лічыў, што ў ЦК РКП(б) добра разумелі пра непазбежнасць вайны з Польскай Рэспублікай, а таму не жадалі рызыкаваць “старымі савецкімі тэрыторыямі”. З другога боку, кіраўніцтва РСФСР патрабавала, “каб сілы і запасы гэтых трох губерняў былі скарыстаны для Паўднёвага і Усходняга фронтаў, на якіх вырашаўся лёс СССР, а не на Заходнім фронце”. Таксама В. Кнорын адзначаў, што ўрад БССР “аказаўся няздольным кіраваць старымі тэрыторыямі Заходняй вобласці; Смаленскі, Віцебскі і Магілёўскі губкомы РКП(б) і губвыканкомы аказаліся фактычна незалежнымі ад Менску” [5].

Я. Бугаёў наогул ставіў пад сумнеў тэрытарыяльнае ўладкаванне Беларусі: “...провозгласить постоянные границы республики в условиях продолжающейся гражданской войны, когда на часть территории Белоруссии претендовали польские империалисты, было нецелесообразно” [6].

С. Маргунскі разглядаў вылучэнне Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў са складу ССРБ у сувязі са стварэннем Гомельскай губерні, паколькі “их терри-

тория в той или иной мере затрагивалась при решении вопроса о создании новой Гомельской губернии” [7].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі працягвае дамінаваць пункт гледжання, згодна з якім на вылучэнне Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў са складу ССРБ паўплывалі неспрыяльныя знешнепалітычныя абставіны [1, с. 47–48; 8; 9]. У. Ладысеў у калектыўным нарысе “Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе” адзначае, што “ў беларускай гістарычнай літаратуры распаўсюджаны тэзіс, што такое рашэнне (аб выдзяленні Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. – *А.Б.*) было прадыктавана прычынамі знешнепалітычнага характару, а менавіта наступленнем польскіх войскаў”. На думку аўтара, на першым месцы пры вырашэнні дадзенага пытання былі прычыны эканамічнага характару: “ва ўмовах грамадзянскай вайны, пераходу да палітыкі харчразвёрсткі асноўнай праблемай для савецкай улады стала харчовая. Выпадзенне з гаспадарчага разліку Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў стварала дадатковыя цяжкасці для функцыянавання традыцыйных гаспадарчых сувязей заходніх губерняў з Цэнтрам” [10]. Дадзенае меркаванне паўтараецца У. Ладысевым у працы “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.” [11]. Аўтары навукова-папулярнага выдання “Беларусь: страницы истории” таксама ставяць пад сумненне дамінуючы тэзіс, што рашэнне аб выдзяленні губерняў са складу ССРБ было прадыктавана надыходам войскаў Польшчы, паколькі “оно началось позже, 14 февраля 1919 г.” [12]. С. Хоміч у сваёй манаграфіі “Территория и государственные границы Беларуси в XX веке: от незавершенной этнической самоиндентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo” вылучыў тры прычыны, што, на яго думку, паўплывалі на рашэнне скараціць тэрыторыю ССРБ. Галоўным для вылучэння губерняў са складу Беларускай рэспублікі, на погляд вучонага, “явились неблагоприятные внешнеполитические обстоятельства. Зимой 1918–1919 гг. Польша все громче заявляла о своих претензиях на белорусские земли”. Іншая прычына выдзялення губерняў са складу ССРБ – “желание ЦК РКП(б) ослабить в республике тенденции развития национального движения”, паколькі “из Москвы внимательно следили за возможным ростом сепаратистских настроений и внутриполитическая ситуация, конфликт между группами А. Мясникова и Д. Жилуновича не могли не беспокоить ЦК РКП(б)”. Апошняя прычына – эканамічнага характару. С. Хоміч адзначае, што “в современной белорусской историографии высказывается также мысль о влиянии экономического фактора”, і ён з гэтым пагаджаецца, бо губерні “играли важную роль в обеспечении продовольствием центральных районов России” [3, с. 145–146].

У шматлікіх публікацыях знайшло адлюстраванне адмоўнае стаўленне кіраўніцтва Віцебскай губерні да ўтварэння ССРБ і ўваходжання ў яе склад. Так, Н. Каменская падкрэслівала, што “вялікадзяржаўныя шавіністы, якія прымазаліся да партыі, звілі сабе гняздо ў некаторых партыйных арганізацыях Віцебскай губерні і спрабавалі выступаць супраць тых таварышаў з Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці, якія ад імя працоўных Беларусі ўзнялі перад савецкім урадам пытанне аб аб’яўленні БССР… Шавініст Шыфрыс даказваў, што ў Беларусі «няма беларусаў – усе рускія»” [13]. У больш позняй публікацыі Н. Каменская пісала: “у (Віцебскай. – *А.Б.*) губернскай газеце змяшчаліся артыкулы, у якіх сцвярджалася, быццам беларуская нацыя насаджаецца зверху, нібыта беларускаму народу чужая ідэя стварэння БССР” [14]. Я. Бугаёў у сваёй працы “Возникновение большевистских организаций и образование компартии Белоруссии” сцвярджаў, што прынятыя ў пачатку студзеня 1919 г. пастановы Віцебскага губкама РКП(б) “насквозь пропитаны великодержавным шовинизмом”. Ён прыходзіць да высновы, што “некоторые витебские коммунисты совершенно неверно понимали ряд важнейших положений марксистско-ленинской национальной программы Коммунистической партии” [6, с. 254–255]. В. Круталевіч у адной са сваіх шматлікіх публікацый піша, што ў Віцебскай губерні “как известно, были особенно сильны антиобластнические тенденции и где очень энергично возражали также и против провозглашения (БССР. – *А.Б.*)” [15].

У працах сучасных беларускіх гісторыкаў таксама адлюстравана адмоўнае стаўленне кіраўніцтва Віцебскай губерні да абвяшчэння Беларускай рэспублікі. Так, В. Пічукоў і М. Старавойтаў упэўненыя, што не было адзінства ў поглядах на ўтварэнне ССРБ і КП(б)Б. У якасці прыкладу прыводзяць пазіцыю кіраўніцтва Віцебскай губерні: “в Витебске считали, что всякие сепаратистские стремления к самостоятельности подрывают силу пролетариата и приносят интересы международного пролетариата в жертву ложноместническим или же националистическим интересам” [16]. У. Ладысеў і П. Брыгадзін у манаграфічным даследаванні “Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.)” адзначылі, што “партыйна-савецкі актыў, грамадскасць Магілёўскай і Віцебскай губерняў псіхалагічна і ідэалагічна былі непадрыхтаваны да факта ўтварэння беларускай дзяржаўнасці” [17]. Гэтае выказванне прыведзена У. Ладысевым таксама і ў яго іншай публікацыі [10]. На думку С. Хоміча, “согласие ЦБ КП(б)Б на передачу Витебской губернии в состав РСФСР объясняется тем, что именно Витебская партийная организация заняла в 1919 г. наиболее непримиримую позицию относительно присоединения к Белорусской советской республике” [3, с. 148].

Другі напрамак у даследаваннях тычыцца вяртання часткі тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад Беларускай рэспублікі. Дадзеная падзея ў гістарыяграфіі ў асноўным разглядаецца ў кантэксце першага ўзбуйнення БССР. Шматлікія аўтары станоўча ставяцца да вяртання ўсходнебеларускіх тэрыторый, але пры гэтым выказваюць розныя меркаванні наконт прычын,

што паўплывалі на вырашэнне дадзенага пытання. У. Ігнатоўскі адным з першых даследчыкаў у калектыўнай працы "Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху" закрануў праблему вяртання ўсходнебеларускіх тэрыторый [18]. Больш грунтоўна дадзенае пытанне было разгледжана ў іншай яго працы "Белоруссия: территория, население, экономика, важнейшие моменты истории". Узбуйненне БССР, менавіта так у савецкай гістарыяграфіі называлася вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый, У. Ігнатоўскі лічыў важным гістарычным актам. На яго думку, Віцебская, Гомельская і Магілёўская губерні "во время революционной борьбы должны были связать себя с РСФСР", паколькі "маленькой Советской Белоруссии надо было проделать подготовительную работу, чтобы быть в состоянии обслуживать и те белорусские территории, которые временно обслуживались Российской Республикой Советов" [19]. Падобную пазіцыю па гэтым пытанні займаў і іншы дзяржаўны дзеяч Беларусі – А. Чарвякоў: "Да 1924 года Савецкая Беларусь, нягледзячы на прапановы з боку Ураду РСФСР, не магла ўключыць у свой склад суседнія беларускія раёны, бо трэба было раней хаця крыху стаць на ногі пасьля вайны" [20].

На думку І. Пятровіча, вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый было выклікана тым, што "Беларуская ССР у складзе шасцёх паветаў ня мела шырокіх пэрспэктыў для развіцця. З мэтай умацавання БССР як самастойнай Савецкай Рэспублікі патрэбна было павялічыць яе тэрыторыяльна" [21].

Працэс узбуйнення БССР у 1924 г. добра асветлены ў аднайменным артыкуле П. Севярына, апублікаваным у "Исторических записках" у 1954 г. Аднак пры гэтым даследчык не надаў увагі пытанню аб адміністрацыйнай прыналежнасці Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў. Толькі мімаходам ён згадаў пра фарміраванне адміністрацыйнай мяжы: "одновременно с работой по районированию происходило уточнение границ с Псковской губернией" [22].

С. Якубоўская лічыла ўзбуйненне БССР "одним из наиболее значительных изменений территорий союзных республик" [23, с. 319]. У сваёй працы "Строительство Союзного Советского социалистического государства" яна звярнула ўвагу на негатыўнае стаўленне Віцебскага губкама РКП(б) да вяртання губерні ў склад ССРБ. Аўтар палічыла неабгрунтаванымі довады, прыведзеныя губкамам РКП(б) на карысць захавання губерні ў складзе РСФСР, і адначасова заўважыла, што гэта быў адзін з рэдкіх выпадкаў, калі губкам РКП(б) адкрыта выступіў супраць рашэння Палітбюро ЦК РКП(б) [23, с. 322–324]. На думку аўтараў нарыса "Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии" "решение вопроса об укрупнении БССР затянулось, потому что ряд руководящих работников Витебской и Гомельской губерний возражали против укрупнения Белорусской ССР" [24]. М. Злотнік у калектыўнай працы "Гісторыя Беларускай ССР" адзначаў, што "асобныя партыйныя і савецкія работнікі Віцебскай і Гомельскай губерняў былі супраць узбуйнення БССР. Патрабавалася рашучая барацьба супраць праяў вялікадзяржаўнага шавінізму, варожага ідэям ленінскай нацыянальнай палітыкі" [25]. Адмоўнае стаўленне кіраўніцтва Віцебскай губерні да вяртання ў склад Беларускай рэспублікі знайшло адлюстраванне ў працах сучасных беларускіх гісторыкаў [26].

Вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР тэндэнцыйна асветлена ў артыкулах шматлікіх акадэмічных энцыклапедый, што пабачылі свет у 1970–1980-я гг. [27–30]. Іх аўтары адзначалі, што вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад Беларускай рэспублікі мела вялікае значэнне для кансалідацыі беларускай нацыі і адбылося на падставе дружалюбных пагадненняў паміж РСФСР і БССР. Згадвае пра дадзеныя пагадненні гісторык і дзяржаўны дзеяч БССР Ц. Гарбуноў: "В апреле 1924 года по соглашению с РСФСР к БССР был присоединен ряд уездов Витебской, Гомельской и Смоленской губерний" [31].

Напярэдадні і пасля працэсу вяртання ўсходнебеларускіх тэрыторый у 1926 г. публікаваліся вынікі этнаграфічных і лінгвістычных экспедыцый у былыя паветы Віцебскай губерні, што засталіся ў складзе РСФСР. Б. Архангельскі ў працы "Южные уезды Псковской губернии и БССР" прааналізаваў дадзеныя розных перапісаў, узровень развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі і на іх падставе зрабіў выснову пра перавагу беларускага насельніцтва ў Веліжскім, Невельскім і Себежскім паветах, а таксама пра іх імкненне да Віцебска [32]. Адной з нешматлікіх спецыяльных прац, прысвечаных гутаркам Веліжскага і Невельскага паветаў, з'яўляецца даследаванне П. Бузука "Да характарыстыкі паўночна-беларускіх дыялектаў: Гутаркі Невельскага і Вяліскага паветаў". На аснове комплексу дадзеных вучоны аднёс гутаркі адзначаных паветаў да паўночнага дыялекту беларускай мовы [33]. Невельскі краязнаўца М. Зорын у зборніку Пскоўскага таварыства краязнаўства "Познай свой край" змясціў артыкул "Вопрос об этнографическом составе населения Невельского уезда в связи с диалектическими особенностями местного говора, с данными истории местного края и экономическими центрами его тяготения", у якім не пагадзіўся з поглядамі П. Бузука. На падставе асабістых даследаванняў М. Зорын прыйшоў да высновы, што ў Невельскім павеце пераважае паўднёвавялікаруская гутарка [34]. Вывучэнне моўнай сітуацыі ў Веліжскім павеце правёў І. Кузьмін. Вынікі даследавання былі апублікаваны ў справаздачы "Отчет о поездке в Великолуцкий округ в 1929 году". На думку І. Кузьміна, "говор здешнего населения – это типичный цокоющий северовосточный белорусский говор" [35].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі замест тэрміна "ўзбуйненне БССР" выкарыстоўваецца "вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР" [36–39]. Упершыню дадзены тэрмін быў выкарыстаны М. Касцюком у другой частцы "Нарысаў гісторыі Беларусі", што была выдадзена ў 1995 г. [40]. Аднак заўважым, што

яшчэ ў 1960-х гг. прадпрымаліся спробы ўвесці новы тэрмін. Так, С. Маргунскі, характарызуючы працэс уключэння ў склад БССР тэрыторый з большасцю беларускага насельніцтва, выкарыстаў тэрмін "воссоединение белорусского народа в составе БССР" [41], аднак ён не прыжыўся.

**Заключэнне.** Такім чынам, існуючыя да цяперашняга моманту навуковыя працы хоць і закранаюць многія аспекты фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР, але не вычэрпваюць усёй глыбіні праблемы, а таму гэта з'яўляецца падставай для далейшага вывучэння заяўленай тэмы пераважна на базе архіўных крыніц. Так, па-за ўвагай айчыннай гістарыяграфіі засталася рэакцыя шырокіх пластоў насельніцтва і інтэлігенцыі Віцебскай губерні як на факт абвяшчэння ССРБ і ўключэння тэрыторыі губерні ў склад Беларускай рэспублікі, так і на яе вяртанне ў склад РСФСР. З другога боку, не вывучалася пазіцыя насельніцтва, інтэлігенцыі і нізавых партыйных арганізацый Віцебскай губерні ў дачыненні да "беларускага пытання" ў 1919–1923 гг. і вяртання ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР у 1924 г.

## Літаратура


1. Казлоў, Л. Беларусь на сямі рубяжах / Л. Казлоў, А. Цітоў. – Мінск: Беларусь, 1993. – 71 с.
2. Хоміч, С.М. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918 – 1926 г.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02: 13.01.00 / С.М. Хоміч. – Мінск, 2000. – 20 с.
3. Хомич, С.Н. Территория и государственные границы Беларуси в ХХ веке: от незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo / С.Н. Хомич. – Минск: Экономпресс, 2011. – 415 с.
4. Турук, Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения белорусов: с приложением образцов белорусской нелегальной литературы, важнейших документов белорусских политических партий и национальных организаций и этнографической карты белорусского племени, составленной акад. Е.Ф. Карским / Ф. Турук. – М.: Государственное издательство, 1921. – С. 45.
5. Кнорын, В. Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі // Полымя. – 1929. – № 1. – С. 95.
6. Бугаев, Е.И. Возникновение большевистских организаций и образование компартии Белоруссии. – М.: Госполитиздат, 1959. – С. 245.
7. Маргунский, С. Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе его развития / С. Маргунский. – Минск: Акад. наук БССР, 1953. – С. 36.
8. Сільчанка, М. Беларуская дзяржаўнасць / М. Сільчанка, І. Басюк. – Гродна, 1997. – С. 233.
9. Гісторыя Беларусі / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш]. – 2006. – 615 с.
10. Ладысеў, У.Ф. Пазіцыя кіраўніцтва Савецкай Расіі ў беларускім пытанні. Утварэнне ССРБ / У.Ф. Ладысеў // Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – С. 156, 159.
11. Ладысеў, У.Ф. Беларускае пытанне ў палітычных варунках Савецкай Расіі / У.Ф. Ладысеў // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1 / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; А.А. Каваленя [і інш.]. – 2011. – С. 384–404.
12. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2011. – С. 194.
13. Каменская, Н.В. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі / Н.В. Каменская. – Мінск: Рэд. паліт. літ. Дзярж. выд. БССР, 1946. – С. 154.
14. Каменская, Н.В. І Усебеларускі з'езд Саветаў. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР / Н.В. Каменская // Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / В.Р. Гняўко, Я.К. Прыгунова, Я.В. Каменская [і інш.]; гал. рэд. І.Я. Марчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.). – С. 142.
15. Круталевич, В.А. Рождение Белорусской Советской Республики: Провозглашение Респ. Развертывание нац.-гос. стр-ва. Нояб. 1918 – февр. 1919 г. / В.А. Круталевич; ред.: А.Ф. Хацкевич, И.А. Юхо. – Минск: Наука и техника, 1979. – С. 182.
16. Пичуков, В.П. Гомельщина многонациональная (20–30-е годы XX века) / В.П. Пичуков, М.И. Старовойтов; Гомел. гос. ун-т. – Гомель, 1999. – Вып. 1. – С. 21.
17. Ладысеў, У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2003. – С. 105.
18. Ігнатоўскі, У. Камуністычная партыя Беларусі і беларускае пытанне / У. Ігнатоўскі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху / Цэнтр. выкан. кам. БССР; пад агул. рэд. А. Сташэўскага, З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага [і інш.]. – Мінск, 1924. – С. 229–242.
19. Игнатовский, В. Белоруссия: территория, население, экономика, важнейшие моменты истории / В. Игнатовский. – Минск: Белтрестпечать, 1924. – С. 48.
20. Чарвякоў, А. Беларусь да Х-й гадавіны Кастрычніка / А. Чарвякоў. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1927. – С. 36.
21. Пятровіч, Я.А. Адноўленая Беларусь / Я.А. Пятровіч. – Менск: Выданне Сакратарыяту ЦВК БССР, 1925. – С. 6.
22. Северин, П.Я. Укрупнение БССР в 1924 г. / П.Я. Северин // Ист. зап. – 1954. – № 46. – С. 289–304.
23. Якубовская, С.И. Строительство Союзного Советского социалистического государства. 1922–1925 гг. / С.И. Якубовская. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1960. – 400 с.
24. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Филиал Инта марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск: Гос. изд-во БССР, ред. социально-экономической литературы, 1961–1967. Ч. 2 (1921–1966) / Н.Н. Акимов [и др.]. – 1967. – С. 37.
25. Злотнік, М.І. Узбуйненне Беларускай ССР / М.І. Злотнік // Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / В.Р. Гняўко, Я.К. Прыгунова, Я.В. Каменская [і інш.]; гал. рэд. І.Я. Марчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.). – С. 262.
26. Уводзіны // Знешняя палітыка Беларусі / М-ва замежных спраў Рэсп. Беларусь [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 2: 1923–1927 гг. / склад.: У.М. Міхнюк [і інш.], 1999. – С. 9–10; Беларусь у міжваенны перыяд: Старонкі паліт. гісторыі ў святле арх. крыніц / Р.П. Платонаў. – Мінск: БелНДІДАС, 2001. – С. 17; Иванова, Т.П. Деятельность местных органов управления Витебской губернии в октябре 1917 – марте 1924 г.: монография / Т.П. Иванова. – Витебск: Междунар. ун-т "МИТСО", 2011. – С. 51.

27. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: у 12 т. / рэдкал.: П.У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1969. – Т. 12: Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. – С. 143.
28. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Минск: Гл. ред. Белорус. сов. энцикл., 1978. – С. 132.
29. Беларусская ССР: Кароткая энцыклапедыя. – Т. І: Гісторыя. Грамадскі і дзяржаўны лад. Заканадаўства і права. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Населеныя пункты. Міжнародныя сувязі. – Мінск: Гал. рэд. Беларус. сав. энцыкл., 1978. – С. 11.
30. Белорусская ССР: Краткая энциклопедия. – Т. 1: История. Общественный и государственный строй. Законодательство и право. Административно-территориальное деление. Населенные пункты. Международные связи / редкол.: П.У. Бровка [и др.]. – Минск: Гл. ред. Белорус. сов. энцикл., 1979. – С. 10.
31. Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М.: Госполитиздат, 1948. – С. 50.
32. Архангельский, Б.Д. Южные уезды Псковской губернии и БССР / Б.Д. Архангельский. – Минск, 1926. – С. 25.
33. Бузук, П. Да характарыстыкі паўночна-беларускіх дыялектаў. Гутаркі Невельскага і Вялiскага паветаў / П. Бузук. – Менск: коштам Ін-та беларус. культуры, 1926. – С. 13.
34. Зорин, Н. Вопрос об этнографическом составе населения Невельского уезда в связи с диалектическими особенностями местного говора, с данными истории местного края и экономическими центрами его тяготения / Н. Зорин // Познай свой край. – Псков: Псков. о-во краеведения, 1927. – Вып. 3. – С. 62.
35. Кузьмин, И.О. Отчет о поездке в Великолуцкий округ в 1929 году / И.О. Кузьмин // Акад. наук СССР. – Б.м., 1929. – 11 с.
36. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў; мастак Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1: Пузелі–Усая. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 566.
37. Гісторыя Беларусі / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – С. 181.
38. Республика Беларусь: Энциклопедия: в 6 т. Т. 7 / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – С. 315.
39. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1 / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; А.А. Каваленя [і інш]. – 2011. – С. 474–494.
40. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 2 / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі [і інш.]; Ін-т гісторыі АНБ. – Мінск: Беларусь, 1995. – С. 104–106.
41. Маргунский, С.П. Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921–1925) / С.П. Маргунский. – Минск: Акад. наук БССР, 1966. – С. 60.

*Паступіў у рэдакцыю 24.10.2019*